


# Беларуская этнаастраномія




Цімафей Авілін
н.с. НАН РБ
http://aviti.livejournal.com
https://ehu-lt.academia.edu/TsimafeiAvilin


Што гэта такое -
ЭТНААСТРАНОМІЯ
???

# Этнаастраномія гэта

- **Этнаастраномія** вывучае народныя астранамічныя веды (Elizabeth C. Baity, 1973г.)
- **Э.** як астранімія і археастраномія - частка **культурнай астраноміі**, якая даследуе астранамічныя аб'екты і з'явы ў культурным кантэксце.
- Аб'ектам даследвання **Э.** з'яўляюцца матэрыяльныя і духоўныя адзінкі, звязаныя з нябеснымі свяцiламі і ўвогулі зорным небам.

# Этнаастранамічны яблык



# … у этнаграфіі



# “Стоўнхендж” на воз.Янова





# Карэц-брацiна (в.Раўбічы)







Калі я апошні
раз глядзеў на
зорнае неба???



# Вялікі Воз

- **В.Мядзведзіца**- Воз, Калёсы, Конь, Калясніца, Гражуля Колы, Іллёў Воз, Давідаў Воз, Чарпак, Коўш, Стажар , Валчыца?
- “чатыры колы, паламаны дышаль” або “воз і тры коні”, “воз з запрэжанымі мядзведзямі‟, Воз перахіліўся, калі Арханёл Міхаіл пагнаў Люцыфера.



- **Алькор:** У дышле стаіць маленькая зорнічка–сучка, калі яна перагрызе вяроўку (“прівей”) будзе канец свету (укр.) У эстонцаў гэта – воўк, які хацеў з’есці вала. "Змей - адна з зорак В.Мядзведзіцы, якая з'яўляецца ў некаторых мясцінах, дзе яна спыніцца на Купалле - людзі будуць шчаслівы"



# Касцы, Тры Сястры, Каромысел

- **Арыён –** Касцы, Тры сястры, Каромысел, Тры Каралі, Граблі, Асілкі, Матавіла, Ляска Якуба

- **Тры каралі** – валхвы, якія прынеслі дары Хрысту;
- **Тры сястры** – магчыма, міфалагічныя тры сястры, якія прадуць ніту чалавечага жыцця
- **Каромысел** – дзяўчына нясе воду каромыслам



“Пара малаціць-каромісла ўжо высока.”
Узыход сузор’я сімвалізаваў пачатак свята Вадохрышча



# Сіта, Валасажар, Вісажар, Куркі, Купкі

- **Плеяды**- Сіта, Валасажар, Вісажар, Валосыня, Стажар'е, Куркі, Сяўцы, Кучкі, Карона, Гняздо, Семь Мальцаў
- **Сіта** – праз яго Бог прасеяў зярнятак жыта; сіта Маці Божай, якое яна пагнула
- **Валасажар, Вісажар, Валосыня** – дакладная этымалогія незразумелая, але магчыма назва звязаная з культам Велеса
- **Стажар'е, Кучкі** – палкі на якіх трымаецца стог сена, або сам стог



- **Куркі –** калісьці Месяц спускаўся на зямлю і тады куркі клявалі зоркі (Тульск. Губ.); куркі выратавалі царкву (харвацк.)
- "Устывай мылаціць, ужо скора дзень будзіць: вісыжар на небе сусім зайшоў", узыход/захад – пачатак свята св.Юр'я

# Арэалы розных намінацый Плеядаў




“Беларуская этнаастраномія : «БДУ – Менск”



# Паўночная зорка

- **Палярная зорка** – Паўночная зорка, зорны кол, “Стаячая звезда...Ні ходзіць нікуда, на месцы...”, “Стаіць як гвоздзь”.

“*Паўночная зорка – арыенцір на поўнач...*”

- **Малая Мядзведзіца** – Малы Воз, Малы Конь, Каромысла(?), М. Мядзведзіца




А яшчэ якія???

# Змей, Араты, Карона







- **Дракон** - “[**Змей**] Таго змея, якога забіў св.Юрый, Бог павесіў ля той самай высокай зоркі, якая заўсёды стаіць на одном месцы.

- **Валапас – Араты**
- **Паўночная карона**
“з дванаццаці гвяздаў Карона ўпляцёна, і на галаву пану Езуса палажона”

# Крыж, Касцы, Ліра







- **Лебедзь**- Петрова палка, Цароў крэст, укр. Чэсный хрэст, славенск. svete Helene križ

- **Касіяпея–** Касцы (чаму???)
  **Ліра** – Нявеста, Два браты,
- Супернік (толькі ў У. Караткевіча)

# Іншыя назвы зорак і Вянеры

- **Капэлла –** Каза, **Сірыус** – psia gwiazda
  **Іншыя** - Гроб, Карона, Змей, Вужы,
- **Венера –** ранішняя/вячэрняя зорка, Заранка, Воўчая зорка, Бэтлеемская зорка, Ведзьма, Мядзведзіца, Мілавіца, Дзянніца, Мар'я (ранішняя) і Дар'я (вячэрняя), Зверыная зорка (?)
  літ. назвы ***планет***: гаспадар, батрак, балгарск. караванка





# Птушыная дарога

- **Млечны шлях** – Птушыная дарога, Гусеча дарога, Журавіна дарога, Малочная дарога, Чумацкі шлях, дарога ў Кіеў, дарога ў Ерусалім, Цёшчына дарога, Дарога Відэвута і Брутэна



*“Мужык даіў кароў і чорт, яму ж Бог прыказаў штоб чэрцям не даваць малака. А ён яму прадаў там за што там...Ну, а Бог увідаў ды і за ім ну, даганяць яго. І ён, во, уцікаўшы, разліў”*


…а якія птушкі ляцяць па гэтай дарозе?



Кнігаўка



Журавель



Верабей



Гусь






**Бусел**

**Качка**

# Лятучая зорка

- **Лятучая зорка** – душа чалавека, які нарадзіўся або памёр; анёл; няхрэшчаны дзіцёнак; ведзьма або чараўнік; вогненны змей; хут; знічка(???)



*«Хут, у каго ў доме жыве, вельмі таму спрыяцель у гаспадарцы, багацце ў дом прыносіць, снапы з чужых палёў у гумно, золата з няведамых скарбаў. Вечарам яго можна часам бачыць на небе, як ляціць вогненны, чырвоны- золата нясе...»*

# Рудыменты астралогіі: ці была???

- *“Дажа такі былі жэншчэны, што на зорькі гадалі. Старуха адна была, дак адна там радзіла дачку, так яна палядзела і што-та ана там знала. Дак кажа: “карацей, дзеўка родзіцца, но бяспарная, адзінокая будзе”. А тады радзіўся…во эта другія, дык яна палядзела, бабка тая, дак кажа: “О, харашо, он і радзіўся ”…і действіцельна было…Адна радзілась красавіца, сорак сватоў пасватала, а за ньякога не пашла і засталася адна. Вы панямаеце, як угадывалі. А што яны там, хто ж іх знае, як яны там знал…”это ужо большая шыбка(?)”, паглядзіць на неба, туды і глядзіць. Ну, вот на зорькі што-та яна глядзела…мала адна мо, што-то ярковато очень, но это (?)…ещё казала: “ещче девочка радiлась бяспарная”*



# Рудыменты астралогіі: ці была???

- **Пра смерць нябожчыка**
  -“ляціць хутка і прама – смерць была імгненнай, хутчэй за ўсё гэтага чалавека забілі”;
  - “ляціць адносна не хутка – смерць была цяжкай, доўга ляжаў і балеў” ;
  - “калі коса-то чалавек памёр сваёй смерцю”;
- **Пра роды**
  - “калі зорка хутка вельмі ляціць, то дзеўка нарадзіць сможа хутка, без усякіх “хлапот””;
  - “калі доўга бачыш зорку – тады роды будуць цяжкімі. Дзеўка будзе мучыцца”;
  - “Калі звёздачка падае, калі [жанчына] ражае ў гэты час, то дзеці [дзіця] могуць памярэць”
- **Пра душэўныя якасці нябожчыка**
  - “калі зорка падае роўна- чалавек быў добрым, чэсным, справядлівым, яго жыццё было такім жа прамым, без хітрынак”;
  - “калі зорка падае крыва, то чалавек пражыў дрэннае жыццё”;
  - “калі зорка падае па небу доўга і не гасне зразу, то помердобры чалавек, яго душа ляціць і свеціцца”;
  - “калі падае хутка і гасне – памёр грэшны, злы чалавек”;



# Рудыменты астралогіі: па зорках

- *“Як е купка зорок до пары - чи четыре, чи шесть - жив. Як нема - погано, пропал, чи шо зробилось”*
- “калі зорка побач з Месяцам - будзе нябожчык”
- *“если небо чистое, значит, скотина погибла, а если есть зорочки - то живая (только того дня як заблудится скотина)“*
- *"Як больной чиловик будэ гадат' так як упадэ на землю звезда, то тот человек умрэ, а як нэ, то будэ жит"“*
- *"[По звездному небу] на Шчодрыка [гадали о женихе]. Дейки глядяць на зорки и баюць: "Гэта моя зорка, а гэта моя". Як скатица зорка, глядяць куды [в какую сторону села] у тым концы жэних будэ"*

# Харвацкая легенда пра сузор'е Квочка (Пляяды)

Падрыхтаваў Цімафей Авілін

Калісьці даўно была адна царква...


ко-
ко!!!
Насупраць яе сядзела
квочка на дрэве


але царкву хацелі
зруйнаваць непрыяцелі…


Прыйшлі тыя ліхадумцы ўвечары і ссеклі дрэва


ко-ко!!!
вочка ўпала, а тады пачала лётаць ды крычаць…


прачнуліся сяляне і
абаранілі царкву


КО!!!
Злачынцы збеглі і іх аніяк не маглі знайсці...


У гэты момант пачулі ў
небе чыйсці крык...


жыхары пайшлі на крык квочкі...


ко-ко!!!
пакуль не дайшлі да месца, дзе схаваліся злачынцы...


ко-
ко!!!
і крык квочкі заціх


Калі арыштоўвалі злачынцаў нехта паглядзеў у неба...


на небе была купка
зорачак, падобныя да
квактухі...

якую гэтак і назвалі  -
Квочка



# Дзякую за ўвагу! Пытанні?! ;)

